# ДУБРОЎСКІ НАСТРОЙ

№109 ТРАВЕНЬ 2008г

НАРОНЫ БАЯВЫ ЛІСТОК ДУБРОВА ПАРЫЦКІ ПАВЕТ


## ФІЛАНТРОПЫ Й АЛЬТРУІСТЫ.

У № 107 наш лісток пісаў пра цяжкае становішча, у якім апынуўся наш зямляк, цяпер ужо нябожчык, царства яму нябеснае, Мікалай Дайнека. Цяжка хворы, без сродкаў да існавання, без сям"і, адно з непаўналетнім сынам-школьнікам. .. Можна толькі ўявіць, што было на душы ў мужчыны. І вось калі ягоны сын папрасіў ў адзінай бачнай яму і, як падавалася, дасяжнай арганізацыі, прафсаюзе дапамогі, яму адмовілі. Сапраўды, куды зьвярнуцца чалавеку ў бядзе? Дзе філантропы? Адмовілі без спачування і спагады, на падставе літары статуту, забыўшы дарэшты пра асноўную гуманную ролю гэтай арганізацыі.

Відавочны факт: камунізм пакінуў нам у спадчыну зьлягчанае грамадства.

Звычайна людзям у бядзе дапамагаюць рэлігійныя, філантрапічныя, іншыя дабрачынныя арганізацыі. Такіх арганізацый у нас німа. Чалавек змалку расьце ў сацыяльнай чэрствасьці, нячуласьці, неспагадзе. Бо такія пачуцці выпрацоўваюцца практыкай , а не «цімураўскім»» рухам.От і дарастаюць да сівізны пад лозунгам «гэта твае праблемы». Грамадзкая ініцыятыва была замененая лапаю дзяржаўнага патэрналізму, калі ладжанне ўсіх клопатаў і турбот грамадзян , былі справаю дзяржавы. Старэйшыя з нас памятаюць, як унывалі людзі, што папрападалі райкамы крывавых камуністаў: не стала каму жаліцца! Райкам замяняўлюдзям пракурора адваката, суддзю, маму, цётку, мараль і сумленне.

Цяперашні мурзаты, каравы, скатамагільны каланіяльны рэжым рэзка тармазнуў стварэнне грамадзянскай супольнасьці. Пабачце, людцы. Калі хто за хоча стварыць якую-небудзь грамадзкую арганізацыю, то такіх людзей адразу ж падводзяць пад крымінальны (так, крымінальны!) артыкул «прыналежнасьць да незарэгістраванай арганізацыі». Бандыты, зладзеі, гвалтаўнікі «працуюць» без ліцэнзіі і за такую «нерэгістрацыю» не перасьледуюцца. Болей за тое, нават тыя арганізацыі, што ацалелі, зараз будуць ліквідаваныя, бо плата за арэнду памяшканняў падвысілася для іх у 10 разоў, на 1000%. Грошай яны не маюць. (Але для сваіх арганізацый улада захавала ранейшыя прывілеі).

Чаму ж так чэрства, па-быдлячаму, паставіўся прафсаюз да чалавека ў нядолі? Таму што пры камуністах прафсаюз быў «пасам ад партыі да мас», «пас» тады вызначаі як «прывадны рэмень». То бок гэта быў струмант таталітарнага рэжыму.

Такім ён і застаўся. Цяперака ён вызначаецца як «стоўп» улады. Такіх стаўпоў, ведайце, тры: а) прафсаюзы б) БРСМ в) мясцовыя саветы. Насамрэч «стаўпоў» болей: гэта і КГБ, і міліцыя, і сетка даносчыкаў, і інквізіцыя, іменаваная «ідэалагічная вертыкаль».

Гэта ўсё паплліскі і пугі на задніцу працоўнага.

Стоўп -ён і ёсьць стоўп.

Вось чаму нясьмелая просьба чалавека перад сконам да «стаўпа» пра дапамогу не была пачутая: вушы ўлады закарэлі.

Тое, што сп. Зьміцер, дырэктар, у гэтым выпадку праявіў альтруізм, гэта праява добрых якасьцей чалавека. Але гэта адначасна паказвае антысацыяльнае аблічча існага стану рэчаў.

Няма сумнення, што мы, нажаль, шчэ не раз пабачым такое абыякавае стаўленне казённай «грамадзкасьці» да чалавека ў бядзе. Асабліва вясковага.

Канешне, у Дуброве ёсьць, хто незадаволены кароткай інфармацыяй на гэтую тэму.

Але тое, што было напісана-праўда. Так багата хто кажа.

## РАДАСНАЯ РАДАЎНІЦА.

Дабрабыт другога пакалення дуброўцаў значна вырас.Гэта было відаць па вялізнай колькасьці добрых легкавікоў, што стялі ля могілак. Багата хто раз на год пабачыўся з раднёю, сябрамі, суседзямі.

На могілках сельсавет пасек карчы і дрэвы. Ставяць бетонную агароджу. І поп прыязджаў. Асвойвае тэрыторыю.

## САЎНА ДЛЯ КОНЕЙ.

Еўрапейскі Хаўрус траціць часам грошы на экзатычныя праекты. Праглядаючы ў аднэй газеціне матэрыял пад назовам «Так ЕХ мантачыць нашыя грошы» позірк упаў на радок 15.000 еўра (каля 45. 000.000 зайчыкаў па нашаму). Аказваецца, столькі грошай выдзелена на збудаванне саўны для коней у Фінляндыі, у занядбаным сельскагаспадарчым раёне. Нельга думаць, што ўсе людзі тамака раскашуюць і болей чыноўнікам няма чаго рабіць, як ладзіць саўну з аддзеламі для кабыл і жарабцоў.

Але чаму ў Дуброве няма грамадзкай лазьні? Няўжо дуброўскія бабу і мужыкі горшыя за фінскіх гнедых?

Усе гэтыя байкі пра 900 чалавек на адну лазьню- дзяржаўна-ідэалагічная лухта.

Каб мы ўступілі ў ЕХ, то маглі б запісацца ў косі і тады маглі б спадзявацца на саўну. А мо й на халяўны авёс?

---

## АЗДАРАЎЛЕННЕ.

Замесь аздараўленне. Пакольк і ў Дуброўскай школе мабільных тэлефончыкаў будзе рамонт, то дзяцей пазапісувалі і будуць вазіць у Кадаш аўтобусам. І шаферу і настаўнікам небут. Ды й які гэта адпачынак, з радыяцыі вазіць у радыяцыю? Ат, адно прытворства.

---

## ПАКРЫЎДЖАНЫЯ.

Моцна пакрыўджанымі адчуваюць сябе работніцы дзіцячага саду і школьныя тэхнічкі.Заробкі ў іх мізэрныя. У дырэктаркі тутэйшай школкі - а сад і школа зараз разамёсьць магчымасьць нияк падтрымаць работніц. «Яна нам ніколі нічога не дае», кажа адна работніца. «Калі й гаворыць што, то з павышаным тонам». Жанчыны справядліва наракаюць, што як прыходзіць разнарадка на пад - піску на дзяржаўна-ідэалагічны друк, то іх змушаюць падпісвацца, бо настаўнікі гідуюць той друк. «Мы ж бачым разьмеркаванне надбавак. Адным настаўнікам і настаўніцам даюць ажно пад сто тысяч рублёў, іншым усяго па пяць тысяч, а нам -кукіш». Кажуць гэта жанчыны паніжаным голасам, каб хто староннi не пачуў.

У простых работнікаў ад парадкаў у Дуброўскай школе прыкрае ўражанне. «Я як пайшла з школы, то як на сьвет нарадзілася. Ды й заробак у мяне цяпер большы», кажа адна былая работніца.

У прыватных гутарках гароў ніцы дзетагадоўлі ўскладаюць усе спадзяванні на Бога. «Дар ма, Бог усё бачыць», кажуць яны.

Застаецца толькі паспачуваць пакрыўджаным дырэк - таркаю жанчынам і дадаць, што і ў другіх школах -Вяжнах, Кадашы- настаўнікі жаляцца на бязьмернае хамства і самадурства дырэктараў.

З аднаго боку надышоў час хамаў. І агрызнуцца не надта выпадае: працоўныя безабарон ныя і незгуртаваныя.

---

## КАНЕЦ ШКОЛЫ.

Восімісят дзетак скончылі нуднае навучанне 24 траўня. Адначасна канчаюць сваю пра цоўную кар”еру некалькі настаўніц і настаўнік. Кажуць, што гэта арыфметык Надзея Паўлаўна, ейны муж настаўнік апазіцыі Мікола Клімавіч ды настаўніца алхіміі і біялогіі Тамара Рыгораўна. Наконт жанчын шчэ невядома, мо як не будзе кадраў, то і гукнуць пагараваць.

А вось пра Міколу Клімавіча дакладна вядома, што яму прад пісаны Berufsverbot, па-нашаму, забарона на прафесію.

Адмысловым вусным распараджэннем загадчыца раённага аддзела адукацыі Людміла Вялічка загадала яго на працу болей не наймаць

(Споўнілася мара дуброўскіх баб пра тое, як бы выгнаць мужчыну з школы. Кухвейкі і Людміла Вялічка тут зьліліся ў экстазе).

Сам Мікола Клімавіч зазначыў што і без Вялічак даўно рашыў, што яму рабіць.

Многія настаўнікі зайздрось цяць пеньсіянерам, бо працаваць самастойнаму чалавеку ў адукацыі зараз дужа пагана.

Многія дзеці адразу ж з”арыентаваліся што да чаго і тут жа перасталі здароўкацца з сваімі амаль былымі настаўнікамі.

Дадамо, што па адмысловых справаздачах «узроўню выхаванасьці» дуброўская школа, пэўне, ставіць сваім падшыванцам добрыя адзнакі.

---

## ПРЫМУСОВЫ ПРОДАЖ

300 асобнікаў дзяржаўна-ідэалагічнага і жоўтага расейскамоўнага друку мусяць прадаць у Дуброве і ваколіцах паштаркі

З насельніцтвам трохі болей за 400 душ, палова якіх функцыянальна непісьменая, гэта ўтапічная задача. Ды й тэматыка тых газет нецікавая сельскаму чытаку. От і мучацца маладзіцы з антыбеларускім неакаланіяльным друкам, выкупляючы яго за свой мізэрны заробак.

---

## ПРЫВІД ПЕРАМЕН.

Псеўдавыбары справілі ў Расеі. Улада памянялася, як бялізна ў турме: пятая камара з шостай, восьмая з дзесятай і г. д. Імператара Пу замяніў імператар Мя. Для нас, беларусаў, зьмена драпежнікаў у Крамлі мала што знача.

## ПАДЛАДЗІЛІ КАНТОРУ.

Значна прывабней выглядае кантора былога калхозу «Шлях да камунізму/Дуброва/ Дубрава (так па-іхняму)-Агра». Чырвоны залезны дах, стандартны жоўты колер, ганак з павецця, гуканепранікальныя вокны і дзьверы- усё гэта прагнала трохі кухвайкавы шэры псівы выгляд ранейшай будыніны.

Працоўныя паціху наракалі на непатрэбную, на іх думку, трату грошай. Але працоўным трэба ўсьведаміць: яны ніколі нічога тут не вырашалі, бо па свайму статусу працоўнай пчалы не складаюць таго пласту людзей, што прымае рашэнні.

Кажуць, што Дуброве наканавана стаць лукашэнкаўскім аграмястэчкам. Хай шчыруюць. Але чаму ў вёсцы лазьні няма?

## КАМПУТАРЫЗАВАЛІСЯ.

На пошце паставілі кампутар грамадзкага карыстання. Кажуць, праз яго можна патрапіць у Інтэрнэт. Ксеракопіі можна зрабіць і на”т сасканаваць тэкст.

Але нешта не відаць, каб ля яго віліся карыстальнікі. Хто не ўмее, каму некалі. Ды і стаіць апарат у нязручным месцы: дужа цеснае памяшканне.

## КАРОЎ ПАМЕНЕЛА.

Значна паменела кароў у Дуброве. Усьлед за Зарэччам, дзе мо засталася адна рагуля на сяло, гавяджы абвал падцікаваў і наша сяло.

Некалькі гадоў таму было ў вёсцы ажно тры статкі прыватных кароў. У статку было да 60 галоў буйнай рагатай скаціны. А зараз з усяе Дубровы зганяюць быдла ў адзін статак. Да таго ж, чуваць размовы, між людзей, што налета яны зьбіраюцца пазбыцца жывёлы.

І дуброўцы пастарэлі, і ўтрыманне скаціны даражэе. Шкада, што прападае народная жывёлагадоўля. Зьніклі авечкі, козы, коні. Прападуць і адмысловыя веды пра скаціну, і прыёмы догляду, і гною не будзе. Яго ўжо амаль німа.

Але будзе мабільны тэлефончык, прывідная ілюзія дабрабыту.

## БУЛЬБА.

Пачалася, адбылася і пасьпяхова скончылася кампанія сяўбы нашай легендарнай нацыянальнай культуры - бульбы, па тутэйшаму- картопляў. Калгасныя каморнікі разам з увішным Фізікам (-Аляксандрам Цярэшчанкам, ён жа Цярэшка) -наразалі зямлю хто колькі заказваў.

(Нечуваная пры камуняках- канешне, пераложных- свабода).

Некаторыя былі незадаволеныя, выймалі палкі і таемна перасоўвалі ўчасткі. І часам прагадвалі, бо абраўшы ніжэй шае месца не разьлічвалі на моцныя дажджы.

Некаторыя гідавалі такой шчодрасьцю, бо засеялі вымарачныя двары.

Аралі, сеялі наймаючы найчасьцей прыватнікаў і тыя шчыравалі.О, свабода!Жах, як успомніш, колькі гвалту, бязладдзя і крыўдаў было пры калхознай манаполіі на калгасным двары. Як людзі баяліся, што «не будзе калхозу, ніхто не пасее». І вось яно, «паляўнічае шчасьце» - бяры-нехачу, сей ад пуза.

Дуброўцы! Шчэ трохі і прападзе калхоз і вы гэтага нават не заўважыце. Хамут у вас заўжды на шыі.От ён і праблема.

## СУПЕРКАЛХОЗ.

Нейк дыктатар сказануў, што не бачыць нічога паганага, калі Беларусь будзе адным вялізным калхозам.

Так і чыніць. Нядаўна ўвесь радыяцыйны Краснапольскі раён ператвораны ў адно аграпрадпрэмства, суперкалхоз. Такім чынам просты работнік, продкі якога былі гвалтам абрабаваныя сталінскімі коршакамі, шчэ раз абрабаваны лукашэнкаўскімі арламі. Гэтыя шчэ раз адсунулі непасрэднага вытворцу- селяніна, ад плёну ягонай працы.

А для расейскіх драпежнікаў справа значна легчае: даць адзін хабар прадажнаму чыноўніку і адным махам прыватызаваць цэлы раён прашчэй, чым саўкацца па калхозіках і даваць багата хабараў. У Шацілках тая ж мегаламанія: зьяднялі саўгас Кабульшчыну і саўгас Горкі.

## КАЗКА ПРА СЕМ СОТ ДАЛЯРАЎ.

Нейк, вупіваючы, ўзгаварыліся дзеўкі пра новыя, палепшаныя планы дыктатара. Адна зь іх, назавом яе Аўдоцця, сказала, што чула «як Лукашэнка абяцаў заробак у 700 даляраў».

Наш хатні каментатар Базыль Залупа заўважыў на гэта: «Вы чулі і ранейшыя абяцанкі заробкі. Дзе яны? Па- другое: : які заробак мае на ўвазе той хлопец: рэальны ці намінальны? Гэта істотна. Па-трэцяе: даляр падае і што сёння 700 заўтра можа бцыь 500. Па-чацвортае: Лічба заробку нішто, калі не ведаць роўню цэнаў. А цэны ж растуць і спыняць іх дыктатар не падмяваўся.Чаму ж ён ні словам ні бедным не кажа пра гэта?

Не вер такім абяцанням, дарагая Аўдотка. Сур”ёзныя людзі кажуць пра рост дабрабыту і спажывання. Казаць пра адну голую зарплату- падман». Мільянерамі мы ўжэ былі.

## БЕРАЖЫЦЕСЯ СЕРГІЯН.

Пасьля таго, як бальшавікі адправілі царкву на доўгія канікулы, ізноў у нашых мясьцінах зьявіліся забытыя прадстаўнікі былой шматлікай авіяфаўны: папы.Цяперака з дзяржаўнай падтрымкай яны барджджэй асвойваюць ляда «кананічнага» поля. Расейская праваслаўная царква верна служыла і служыць імперска-каланіяльным інтарэсам Маскоўскага царства. У 1589 годзе канстанцінопальскі патрыярх за грошы прызнаў іхняга мітрапаліта патрыярхам. Пасьля Пятро І лікві даваў патрыяршаства і зрабіў царкву часткаю ўраду да 1917

Пасьля бальшавіцкага пагрому 1917 і наступных год адноўленыя «патрыярхі» сталі пад амафору ГПУ/КГБ і падпалі пад цяжкі грэх сергіянства. Цяперашні патрыярх Маскоўскі і «Ўсяя Русі», кажуць, быў агентам КГБ з мянушкаю «Драздоў».У такіх умовах ці шмат знойдзецца сьветароў, што шчыра будуць дбаць пра адмысловыя духоўныя патрэбы беларусаў? У Беларусі бальшавікі забілі 2000 папоў. Зьнішчылі ўсіх! У Дуброве на месцы царквы і царкоўных могілак збудавалі Дом Кульбуры.

От і ў Вяжнах паставілі царкву імя расейскага сьвятога Амфілохія Пачаеўскага. Няўжо ў Беларусі няма сваіх сьвятых, што трэба імпартны? Амфілохій даволі малады сьвяты. Усяго мо год з сорак, як спачыў.

.Яшчэ невядома, як гэты русак будзе спрыяць чужым яму вежнаўцам. Хай задабраюць.

На Вялікадня папа ў Дуброву прывёз прамоўтар-прапіхач опіуму для народа, сам сп. Анатоль Крывалап, старшыня сельрады.

А праваслаўныя празеліткі фанатычкі-настаўніцы прыцягнулі 22 траўня папа ў школу, хоць адукацыя і царква ў нас разьдзеленыя і дзяржава ад царквы таксама.

**СХВАТКА ЗА «КАНАНІЧНАЕ» ПОЛЕ** ?

Тым часам, кажуць, рыхтуецца канкардат /дамова/ Беларусі і царства Ватыкан, што ўрэгулюе статус каталіцтва .То мо і ў нас зашпацыруюць ксяндзы і іезуіты? І дай, Божа, шматвектарнасьць твайго ісьціннага вучэння. Нам дарага збавенне ад пекла, але не з сергіянскіх маскоўскіх кадзіл.

## НАЦЕ ВАМ САВЕТЧЫНУ.

Школа ізноў вернецца да 11гадовага навучання. Кажуць, зьліквідуюць гімназіі і ліцэі, каб была «роўнасьць». («Роўнасьць» стала ідэяй-фікс дыктатара, насамрэч, гэта нахабны падман. Усе ведаюць, якая роўнасьць у гэтай дзяржаве). Адначасна выкінуць і прадмет «Гісторыя Беларусі», каб беларусы не мелі ўяўлення пра сваю гісторыю. Народ без гісторыі- гэта не народ, а парахня. От у што зьбіраецца ператварыць нас каланіяльны рэжым.

Болей за тое: сама адукацыя вернецца да хвалёнай савецкай сістэмы задурання мазгоў, выхавання рабоў рэжыму. З працы звольняць каля 10.000 настаўнікаў.

Бескультурны бязграматны рэжым цягне Беларусь назад у саветчыну. Пасьля такой «рэфармацыі» у нас будзе не адукацыя, а бэдлам.

## ЗАБЫЛІСЯ НА ВЕТЭРАНА.

Пад час раздачы сотак брыгадзірыха не дала ўчастка чарнобыльскаму ліквідатару калгасьніку Пратасеню Ігару. Дырэктару сп. Зьмітру яна прызналася, што такога не ведала.

Зрэшты, сам сп. Ігар не настойваў, тым болей, што сп.Зьміцер паабяцаў проста выпісаць Ігару бульбы ўвосень.

Людзі кажуць, што брыгадзірыха не дужа таварыская асоба, што можа вырвацца зь яе ліхое слова. Унь як яна сказанула Галі Зайцавай, калі тая запярэчыла наконт сотак.

Сп. Зьміцер, дырэктар, напэўна, ніколі не дасьць ёй легкавушкі, як усім астатнім кіроўным зьвеннявым.

**НЕ ШАНЦУЕ** Акурат на Радаўніцу 6 траўня зламысьнікі абакралі манапольку. Злачынцы залезьлі праз дзьверы, дзе чамусьці не было сігналізацыі. Ўзялі небагата: пару скрынак выпіўкі, сякую-такую закусь і спажывалі гэта за пару гоняў ад крамы пад ліпкамі. Канешне, ўсяго не выжлукцілі.

Прыязджала міліцыя з сабакам. Знайшлі вінаватага- былога вязьня ЛПП з Шацілак.

А праз некалькі дзён новая бяда: знайшлі ў краме фальшывыя грошы. Ізноў зачынілі краму. Ізноў перажыванні.Тым часам работнікі пачалі бурыць так і неўжываны будынак чарнобыльскай крамы.

Друкарня імя Ігната Масьціцкага, былога Прэзідэнта Польшчы. Ён быў хросным бацькам кожнага сёмага дзіцяці ў сям"і.
Накл. 100 ас.

Пайшла ад нас
добрая беларуска
**БУСЕЛ**
**Марыя Максімава.**
Хай ёй зямля будзе пухам.

Пайшоў ад нас
добры вясёлы беларус,
чарнобыльскі ўцякач
**ДРАКА**
**Аляксандр Аляксандраў**.
Хай яму будзе мяккай зямля